# «ДРЭВА ВЕДАЎ» ЯК ПРЫЁМ ПРАВЕРКІ ДАМАШНЯГА ЗАДАННЯ ПА ЛІТАРАТУРНЫМ ЧЫТАННІ

***Знавец В.*** *(УА МДПУ імя І.П. Шамякіна),* ***Сычэўская В. І.****, настаўнік пачатковых класаў (ДУА «Сярэдняя школа № 1 г. п. Лельчыцы»)*

Эфектыўнасць дамашняй працы ў працэсе навучання малодшых школьнікаў шмат у чым залежыць ад таго, як настаўнік арганізуе і накіроўвае іх дзейнасць, звязаную з выкананнем гэтай формы работы. Кіраўніцтва дамашняй працай ён ажыццяўляе не толькі ў працэсе задавання ўрокаў на дом, але і ў працэсе іх праверкі. Ад спосабаў і прыёмаў праверкі выканання дамашніх заданняў істотна залежыць і характар іх выканання.

Неабходнай умовай выканання дамашняга задання з'яўляецца яго абавязковы кантроль настаўнікам. Вучань павінен бачыць вынікі сваёй працы і атрымаць ацэнку з боку настаўніка і аднакласнікаў. Заданне губляе сэнс, калі яно застаецца неправераным. Формы праверкі заданняў могуць быць розныя; галоўнае, каб пры гэтым не было фармальнасці, каб праверка дамашняга задання павысіла якасць папярэдняга ўрока і яго выніковасць [1].

У вучняў малодшага школьнага узросту адбываецца станаўленне пазнавальных інтарэсаў. «Пазнавальная цікавасць, – сцвярджае Г. І. Шчукіна, – выступае перад намі як накіраванасць выбару асобы, звернутая да галіны пазнання, да яе прадметнага боку і самога працэсу авалодання ведамі» [2, с. 34].

Вельмі важна ў гэты час не ўпусціць магчымасць развіць пазнавальную цікавасць вучняў да літаратурнага чытання як да вучэбнага прадмета. Таму адной з найцяжэйшых і найважнейшых задач дыдактыкі як была, так і застаецца «праблема выхавання цікавасці да навучання» [3, с. 35].

Варта адзначыць, што пазнавальная цікавасць не толькі ўяўляе сабой важны фактар навучання, але ў той жа час з'яўляецца жыццёва неабходным фактарам станаўлення асобы. Яна спрыяе фарміраванню агульнай накіраванасці дзейнасці школьніка і можа адыгрываць значную ролю ў станаўленні і развіцці якасцей асобы вучня. Каб пазнавальная цікавасць вучняў узрастала, праверка дамашняга задання павінна праходзіць цікава і займальна, з выкарыстаннем новых прыёмаў, якія дазволяць вучням засвоіць матэрыял больш свядома. Веды, атрыманыя без цікавасці, не могуць быць трывалымі.

Рэгулярная праверка аказвае вялікі ўплыў на якасць выканання дамашняга задання. Пры гэтым эфектыўнасць самастойнай працы вучняў дома залежыць не толькі ад патрабаванняў, што прад'яўляюцца настаўнікам да выканання дамашняга задання, але і ад прыёмаў яго праверкі, якія павінны быць разнастайнымі не толькі па форме, але і па змесце. Калі праверка дамашніх заданняў праводзіцца пастаянна, то вучні больш адказна ставяцца да іх выканання і імкнуцца працаваць дома самастойна, каб быць гатовымі да ўрока.

МГПУ им. И.П.Шамякина

Эфектыўным прыёмам праверкі дамашняга задання з’яўляецца гульня «Дрэва ведаў». Сутнасць яе заключаецца ў тым, што вучням прапануецца самастойна скласці дома пытанні па прачытаным творы, на лісточках «з дрэва», якія настаўнік падрыхтаваў загадзя. Перад урокам літаратурнага чытання дзеці прымацоўваюць «лісточкі» са сваімі пытаннямі на дрэва, якое зроблена для гэтага ў паменшаным памеры або намалявана на дошцы ці на лістку паперы. Пры праверцы дамашняга задання кожны з вучняў зрывае «лісточак» з пытаннем аднакласніка і адказвае на яго.

Аднак вучням пачатковых класаў вельмі цяжка складаць пытанні паводле прачытанага тэксту, іх трэба гэтаму вучыць. Праведзены эксперымент паказаў, што трэцякласнікі без спецыяльнай падрыхтоўкі яшчэ не могуць у поўнай меры справіцца з гэтым заданнем. Так, да апавядання Ядвігі Бяганскай «Каму сказаць дзякуй?» [4, с. 102] яны прапанавалі пытанні, якія носяць пераважна абагульнены характар, не раскрываюць зместу твора. Таму патрэбна клапатлівая, творчая праца з дзецьмі, каб навучыць іх складаць пытанні. Яна патрабуе ад малодшых школьнікаў асаблівай увагі пры чытанні тэксту, валодання зместам прачытанага і ўключае некалькі этапаў: навучанне складанню пытанняў на ўроку; практыкаванне ў складанні пытанняў на ўроку; самастойная падрыхтоўка пытанняў дома.

На першым этапе настаўнік паведамляе вучням, что на ўроку яны будуць вучыцца складаць пытанні. Каб пытанні былі прыгожымі, неабходна складаць іх у адпаведнасці з наступнымі правіламі:

Пытанні пачынаюцца з пытальных слоў: *Дзе? Куды? Адкуль? Чаму? За што? Як?* і інш.

Напрыклад: *Дзе стаяла карова?* Пытальны сказ заўсёды вымаўляецца з пытальнай інтанацыяй. Гэта значыць, пытальнае слова вымаўляецца з большай сілай голасу. Напрыклад: ***Што*** *сказала бабуля?*

У час знаёмства з новым творам вучні чытаюць тэкст па абзацах або па сэнсавых частках. Так, апавяданне Ядвігі Бяганскай «Каму сказаць дзякуй?» мы падзялілі на 5 сэнсавых частак.

Пасля чытання першай часткі вучні прапанавалі наступныя пытанні:

*– Што прынесла бабуля ўнукам? (Гладыш малака.)*

*– Якімі словамі бабуля апісвае малако? (Яно смачнае, карыснае.)*

*– Што сказалі ўнукі, выпіўшы малако? (Дзякуем табе, бабуля.)*

*– Каму прапанавала дзякаваць бабуля? (Прапанавала дзякаваць кароўцы.)*

Вучні, адказаўшы на пытанні, чытаюць 2-ую частку. Пасля чытання другой часткі яны прапанавалі пытанні:

*– Дзе стаяла кароўка? (Каля студні.)*

*– Што такое студня? (Калодзеж.)*

*– Каму прапанавала дзякаваць кароўка? (Прапанавала дзякаваць траве.)*

Працуючы з 3-ай часткай апавядання, вучні склалі наступныя пытанні:

*– За што дзякавалі дзеці траве? (За тое, што корміць кароўку.)*

*– Што адказала трава дзецям? (Падзякуйце зямлі, на якой я расту.)*

Пытанні да чацвёртай сэнсавай часткі:

*– За што дзякавалі дзеці зямлі? (За траву, якую скубе кароўка.)*

*– Што адказала зямля дзецям? (Падзякуйце вадзе, якая поіць траву.)*

Пытанні да пятай сэнсавай часткі:

*– За што дзякавалі дзеці ваду? (За тое, што поіць траву, якую скубе бабульчына кароўка.)*

*– Што адказала вада дзецям? (Падзякуйце і сонцу за цяпло).*

На другім этапе вучні дзеляцца на каманды: па варыянтах або па радах. Ім неабходна скласці пытанні па прачытаным апавяданні ў групах. Настаўнік папярэджвае, што пытанні не павінны паўтарацца. Адной камандзе прапануюць задаваць пытанні для высвятлення таго, як другая каманда зразумела твор. Настаўнік разам з дзецьмі вызначае лепшае пытанне і лепшы адказ. Потым каманды мяняюцца ролямі.

Назіранні за працай вучняў паказалі, што калі яны самі задаюць пытанні, іх пазнавальная дзейнасць на ўроку працякае больш прадуктыўна. Праз пытанні ў вучняў уключаецца матывацыйны механізм асобы, актывізуюцца інтарэсы, патрэбы, імкненні. Сістэматычнае выкарыстанне прапанаванага прыёму забяспечвае развіццё пазнавальных навучальных дзеянняў.

МГПУ им. И.П.Шамякина

На трэцім этапе вучням прапануецца дома скласці пытанні па прачытаным творы на «лісточках», падрыхтаваных настаўнікам загадзя.

Настаўнік пры гэтым павінен выступаць не толькі ў ролі кантралёра ведаў і ўменняў, але і ў якасці памочніка, які карэктуе працэсы засваення ведаў.

Вучні, якія ведаюць, што настаўнік на кожным уроку з дапамогай наяўнага ў яго арсенала метадаў і прыёмаў абавязкова праверыць узровень ведаў, уменняў і навыкаў кожнага, пачынаюць сістэматычна рыхтавацца да ўрокаў, набываюць упэўненасць у сабе.

**Літаратура**

1. Чехлова, Т. Ф. Домашнее задание учащихся: приглашение к дискуссии / Т. Ф. Чехлова // Русский язык и литература. – 2008. – № 8. – С. 50–52.

2. Щукина, Г. И. Педагогические проблемы формирования познавательного интереса учащихся / Г. И. Щукина. – М. : Просвещение, 1995. – 160 с.

3. Кузнецов, Б. М. Воспитание интереса к изучению математики в школе / Б. М. Кузнецов. – Иркутск : Изд-во Иркутского ун-та, 1989. – 131 с.

4. Жуковіч, М. В. Літаратурнае чытанне : вучэб. дапам. для 2-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання : 1 ч. / М. В. Жуковіч. – Мінск : НІА, 2016. – 145 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина